
Падтрымай "Вясну" на PATREON

Першы прысуд за шэсце ў Курапаты: 3 гады "хатняй хіміі"

15.01.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед

Суд Першамайскага раёна Мінска 15 студзеня вынес першы прысуд па крымінальнай справы паводле ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса за нядзельны Марш "Дзяды" 1 лістапада, калі Следчы камітэт прызнаў падазраванымі па справе 231 чалавек. 47-гадовага Міхаіла Глухоўскага асудзілі на тры гады "хатняй хіміі", абвінаваціўшы яго ў перакрыцці дарогі каля Парку Чалюскінцаў падчас шэсця ва ўрочышчы Курапаты, чым прычыніў шкоду "Мінсктрансу" на суму больш за 10 тысяч рублёў. Суддзя Святлана Чараповіч прызначыла менавіта такое пакаранне, якое запрашвала дзяржаўная абвінаваўца Ірына Зубко. "Вясна" з дапамогай валанцёраў назірала за гэтым судовым працэсам – распавядаем яго абставіны.



Міхаіл Глухоўскі на Маршы. Фота: sk.gov.by

У чым абвінавацілі мужчыну?

Міхаіла Глухоўскага затрымалі 1 лістапада ў 14:40 ва Уруччы. З Першамайскага РУУС яго перавезлі ў Жодзіна, дзе асудзілі за ўдзел у мітынгу 1 лістапада па ч. 1 арт. 23.34 КаАП на 15 базавых велічынь (405 рублёў) і адпусцілі. Аднак праз тыдзень Міхаіла зноў затрымалі – ужо ў межах крымінальнай справы па ч. 1 арт. 342 КК. Неўзабаве мужчыну выпусцілі пад даручальніцтва маці і сына. Пазней Міхаіла асудзілі яшчэ раз па арт. 23.34 КаАП на 20 базавых велічынь – за ўдзел у акцыі 18 кастрычніка (Марш партызан).

Паводле абвінавачвання, 1 лістапада з 13:00 да 17:15 гадзін Міхаіл Глухоўскі браў удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, што адбывалася на праспекце Незалежнасці ў Мінску. Разам з неўстаноўленымі асобамі абвінавачаны *"доўга і ўпарта парушаў грамадскі спакой, а пры знаходжанні ў першых шэрагах масавага мерапрыемства ён прыняў удзел у блакаванні шляхоў транспартных камунікацый шляхам выхаду групай асоб на праезную частку паблізу дамоў 95А-111 па праспекце Незалежнасці Мінска"*. У выніку прыпынку транспартнага руху камунальнаму прадпрыемству «Мінсктранс» была нанесена шкода на агульную суму 10 689 рублёў 76 капеек. Паводле абвінавачвання, у выніку дзеянняў пратэстоўцаў днём 1 лістапада быў прыпынены рух 14 аўтобусаў і 10 тралейбусаў у раёне праспекта Незалежнасці, вуліц Валгаградскай, Кедышкі, Лагойскі тракт, Філімонава, Каліноўскага і іншых.

Міхаіл Глухоўскі прызнаў сваю віну часткова: ён пацвярджае, што браў удзел у мірным маршы, але не прызнае, што прычыніў шкоду на такую суму і што ягоныя дзеянні пацягнулі прыпынак грамадскага транспарту па столькіх маршрутах. Мужчына патлумачыў у судзе, што выйшаў на шэсце 1 лістапада, каб выказаць мірны пратэст.

> *"Я правёў пяць хвілін на праезнай частцы, і я не згодны з сумай, таму што я не мог нанесці сваімі дзеяннямі такую шкоду і такой колькасці транспартных сродкаў.*
>
> *Я не блакаваў дарогу, не кідаўся пад транспарт, не спыняў такую колькасць транспартных сродкаў. Дзе знаходзіцца Парк Чалюскінцаў, а дзе знаходзіцца кальцавая дарога і Лайгойский тракт. Як я мог умяшацца сваімі дзеяннямі ў працу транспарту там?",* – казаў мужчына на першым паседжанні.

Сведкі ў балаклавах. Чым даказалі віну?

Дзяржабвінаваўца сказала, што віна Глухоўскага пацверджаная паказаннямі супрацоўнікаў АМАПу, відэазапісам і звесткамі аб тэлефонных злучэннях.

Сведкамі выступілі чацвёра АМАПаўцаў у масках, якія не памяталі абвінавачанага. У іх былі зменены прозвішчы. Ніводзін з дапытаных у судзе супрацоўнікаў АМАПу не бачыў і не затрымліваў Глухоўскага. Допыт сведак заняў 40 хвілін.



Сведкі па справе Міхаіла Глухоўскага. Фота: spring96.org

Пакаранне

Дзяржаўная абвінаваўца Ірына Зубко прасіла суд прызнаць Глухоўскага вінаватым па ч.1 арт. 342 УК і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ва ўстанову выпраўленчага тыпу тэрмінам на тры гады. Суддзя Чараповіч прызначала менавіта такое пакаранне. Таксама Міхаілу Глухоўскаму "Мінсктранс" выставіў грамадзянскі пазоў на суму 10 689 рублёў 76 капеек, ён будзе разгледжаны на іншым судовым паседжанні ў грамадзянскім парадку.

Першы дзень суда:



У Мінску пачаўся першы суд па крымінальнай справе за шэсце ў Курапаты, падазраванымі якой сталі 231 чалавек

Суд Першамайскага раёна Менска 4 студзеня пачаў разгляд крымінальнай справы паводле ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса ў дачыненні да 47-гадовага мінскага прадпрыемства Міхаіл Глухоўскага. Мужчыну абвінавачваюць у перакрыцці дарогі каля Парку Чалюскінцаў 1 лістапада на нядзельным маршы "Дзяды" або шэсці ва ўрочышчы Курапаты.




"Такога ў гісторыі Беларусі не было са сталінскіх часоў". Алесь Бяляцкі пра крымінальную справу за "Дзяды"

У панядзелак другога лістапада Следчы камітэт Беларусі паведаміў, што пасля нядзельнай акцыі ў Мінску "Дзяды" ўзбуджана крымінальная справа за арганізацыю дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (арт. 342 КК РБ). І падазраванымі па гэтай справе адразу прызнаны ажно 231 чалавек. Следчыя дзеянні і аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы працягваюцца, паведамляе СК.

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

33 журналісты за кратамі адзначаюць Сусветны дзень свабоды друку. Пераслед незалежных медыя ў Беларусі

21 траўня — Дзень палітвязняў у Беларусі. Далучайся да акцый салідарнасці!

659 маладзёнаў знаходзяцца за кратамі (дакумент)

Дайджэст вызваленых: 11 палітвязняў у красавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

У красавіку судамі ў крымінальным парадку рэпрэсавана не менш за 43 чалавекі

За "здраду дзяржаве" пачалі судзіць былога начальніка службы паветранай выведкі

Заява праваабаронцаў аб прызнанні пяці палітычных зняволеных

У Гомелі пачалі судзіць па пратэсных артыкулах бармена "Кватэрніка" Глеба Вятошкіна

"Я з'язджаў з Беларусі, а ў суд ішла папера пра змену пакарання". — "хатні хімік" Кірыл Кятурка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

